# ПАМІЖ АБЛОКАМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Дзеці ўжо дарослыя, — тлумачыць ён тое, якім чынам знаходзіць час на любімы занятак. — А ў кінастудыі мне вельмі цікава. Там сабраліся аднадумцы — 10 чалавек. Людзі розных прафесій і ўзростаў. Раім адзін аднаму, разам прыдумваем сюжэты...

Кінааматарам-пачаткоўцам Дзмітрый раіць не купляць дарагую камеру, а прыдумаць добры сцэнарый: на конкурсах перамагаюць і тыя, хто здымаў прымітыўнай тэхнікай. Члены журы перш за ўсё ацэньваюць нестандартны падыход для раскрыцця ідэі.

Дзмітрый Іўчанка — аўтар дзясяткаў фільмаў. Многія былі высока ацэненыя на конкурсах, у тым ліку стужка «Мы — нашчадкі дручан». Гэтую карціну сам аўтар лічыць найбольш удалай.

— Працаваць над гэтым фільмам было цяжка. Шмат пастановачных кадраў. Віцебскі клуб гістарычнай рэканструкцыі спецыяльна для мяне інсцэніраваў пабоішча. Здымаў на месцы былога цэнтра Друцкага княства. Гэта недалёка ад Талачына. Дарэчы, там захаваліся рэльефы абарончых збудаванняў, равоў, месца, дзе жыў князь. Аналагаў у Беларусі няма, — расказвае Дзмітрый.

Цяпер талачынскі летапісец збіраецца зняць фільм пра Свята-Пакроўскі жаночы манастыр. Будынак храма ў Талачыне ўражвае, гісторыя манастыра багатая на падзеі.

## На вышыні больш за 5,6 км

Амаль штогод Дзмітрый адпраўляецца ў доўгія і экстрэмальныя падарожжы. Асноўнае месца працы дае яму права на бясплатны праезд па чыгунцы да любой станцыі большасці краін былога СССР. Ён быў у водных паходах у розных рэгіёнах Беларусі, на Урале, у Крыме, Карэліі... Пакараў вяршыні на Каўказе, Урале, Хібінах, Карпатах.

— Канешне, небяспечна, — пагаджаецца Дзмітрый. — Але цягне да рэк і ў горы.

Можа, справа ў самым першым уражанні? Калі ён першы раз у жыцці падняўся ў Карпатах на вышыню прыкладна 1,6 кіламетра, прачнуўся раніцай і ўбачыў, што над галавой аблокі і пад нагамі — аблокі! І сонца ўстае... Ён тады адчуў незвычайны прыліў энергіі, зрабіў здымак і ніколі гэтага моманту не забывае.



Паміж аблокамі ў Карпатах.

Фота Дзмітрыя ІЎЧАНКІ.

Потым быў Эльбрус, дзе Дзмітрый з мінскімі сябрамі падняліся на паўночную частку ўсходняга кратара (5610 метраў над узроўнем мора). А яшчэ ён стаяў на Урале — паміж Еўропай і Азіяй. Ён бачыў, як над ільдом і снегам лётаюць... матылькі. Такое можна сустрэць на вышыні прыкладна 4000 метраў над узроўнем мора.

— Сапраўды, цуд! Ноччу тэмпература там апускаецца да -15 °С, а днём, наадварот, — з плюсам. І лётаюць матылькі, растуць кветкі, — дзеліцца ён успамінамі.

У Карэліі і Хібінах на шыраце Палярнага круга Дзмітрыйназіраў белыя ночы. Там, як у космасе, няма адчування часу...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

*г. Талачын.*

# ДЗІЦЯ ХОЧА ЕСЦІ КОЖНЫ ДЗЕНЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як і жыхар Століна, які забыўся пра свой бацькоўскі абавязак. Гісторыю гэтага грамадзяніна расказала яго былая цешча кіраўніку вобласці на прамой лініі. Пасля разводу малады мужчына нідзе не працуе і, адпаведна, дзецям не дапамагае. Больш за тое, за названае правапарушэнне ён ужо адседзеў поўны тэрмін, выйшаў на волю і працягвае ў тым жа стылі. У міліцыі былой жонцы сказалі, што нядбайнага бацьку хутка зноў накіруюць у месцы пазбаўлення волі. «Але ж нам не трэба, каб ён сядзеў, сям'і трэба, каб працаваў і плаціў», — горача даводзіла жанчына. А як гэтага дабіцца на справе?



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Праведзены пракуратурай аналіз сведчыць, што асноўная прычына нявыплаты аліментаў — адсутнасць работы і пастаяннай крыніцы даходаў. Летась на момант вынясення прысуду 79 працэнтаў неплацельшчыкаў не працавалі, кожны трэці не працаваў больш за два гады, значыць, сам з'яўляўся ўтрыманцам. Больш за тое, кожны трэці з такіх бацькоў вёў асацыяльны лад жыцця, кожны чацвёрты стаяў на ўліку ў нарколага. Вось такі сацыяльны партрэт неплацельшчыка вымалёўваецца па выніках адной пракурорскай праверкі. Тут, вядома, паўплывалі змены на рынку працы — пагаршэнне матэрыяльнага дабрабыту. Але ж нельга закрываць вочы і на агульнае падзенне нораваў, якому, несумненна, спрые п'янства пэўнай катэгорыі суайчыннікаў.

**Пракурор Брэсцкай вобласці Віктар КЛІМАЎ** сказаў, што памяняць сітуацыю да лепшага можна не карнымі, а, найперш, ідэалагічнымі метадамі. Паводле меркавання пракурора, трэба вакол гэтых асоб стварыць атмасферу нецярпімасці, а таксама стымуляваць іх працаўладкаванне. Усё правільна. Толькі як гэта зрабіць на практыцы, дакладна не ведае ніхто. Як дастукацца да сумлення людзей, якім фактычна ўсё «да лямпачкі»? Цяперашнія бацькі-ўхілісты — людзі з пакалення канца СССР. Іх светапогляд фарміраваўся ў зломе эпох, калі старыя ідэалы адышлі, новыя не з'явіліся, а іх месца паступова займала прывабная карцінка грамадства спажывання. Гэта пакаленне пачатку экранных баевікоў, інтэрнэту, даступнага алкаголю, аднаснай свабоды. Людзі, якіх у сям'і не навучылі ўсведамляць свой абавязак перад блізкімі, грамадствам, рэшткі сумлення адключаюць гарэлкай. Яны жывуць толькі сённяшнім днём. Тая жанчына са Століна расказвала, што яе былы зяць, калі з ім спрабавалі гаварыць, заяўляў: «А я не збіраюся ісці на работу. Ну і што, што адседжу нейкі час, потым зноў вярнуся».

Цяжка вакол такога чалавека стварыць атмасферу нецярпімасці, калі ў яго застаўся фактычна адзін жыццёвы клопат: выпіць і паесці. Але ж і ўпускаць выхаваўчую работу недапушчальна. Трэба спрабаваць дастукацца да тых, хто яшчэ можа паддавацца ўплыву.

У адным з сельсаветаў расказвалі сумна-кур'ёзную гісторыю неплацельшчыка. Даволі яшчэ малады бацька пакінуў сям'ю, а былой жонцы сказаў, што едзе на заработкі. Потым спраўна слаў sms-кі, у якіх паведамляў, што знаходзіцца на будоўлях Расіі, на сельгасплантацыях Польшчы, і дабаўляў звычайна: «Грошы прышлю потым» альбо «Заплачу пазней». Яна і чакала, спадзявалася, нават у міліцыю не звярталася, каб ладзілі вышук неплацельшчыка. Але ж дзеці хочуць есці кожны дзень, і маці стала пакрысе насводзіць даведкі. І трэба ж, нехта з аднавяскоўцаў яго выпадкова ўбачыў літаральна за 15 кіламетраў, у вёсцы суседняга раёна. Нядбайны бацька жыў у тамтэйшай удавы, як той казаў, на поўным забеспячэнні. На работу не хадзіў, хіба толькі дапамагаў гаспадыні на агародзе. Але як толькі да яго прыехалі і сказалі, што за ўхіленне ад аплаты аліментаў ён можа нават атрымаць тэрмін пазбаўлення волі, вясковы гастралёр спалохаўся. Пайшоў прасіцца ў мясцовы калгас, і цяпер грошы на дзяцей былой жонцы прыходзяць рэгулярна. На жаль, не заўсёды так бывае, каб адна прафілактычная гутарка падзейнічала.

На каардынацыйнай нарадзе адзначалі, што праблема нявыплаты аліментаў на ўтрыманне дзяцей цесна звязаная з дрэнным сацыяльным і сямейным становішчам. Дзеці і так растуць у няпоўных сем'ях, да таго ж яны не маюць матэрыяльнага дастатку, і як вынік, не наведваюць спартыўныя секцыі, музычныя, мастацкія студыі, больш уразлівыя псіхалагічна, часцей за іншых дапускаюць правапарушэнні, праяўляюць схільнасць да суіцыду. Вось доказ: за два гады колькасць дзяцей, якія стаяць на ўліку ў ІСН, чые бацькі ўхіляюцца ад аплаты аліментаў, вырасла ў тры разы, а тых, што знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, стала ў паўтара раза больш.

Так што да неплацельшчыкаў трэба прымяць усе магчымыя меры: і выхаваннем, і прымусам дабівацца ад бацькоў удзелу ў справе ўтрымання дзяцей. І думаць, як выхоўваць будучых сямейнікаў з самага ранняга ўзросту.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

## ■ Ну і ну!

# Дзеля выпіўкі ўкрала дыван

**Супрацоўнікі міліцыі затрымалі ў сталіцы 32-гадовую мінчанку.**

— Скарыстаўшыся тым, што гаспадара не было дома, жанчына патрапіла ў кватэру свайго знаёмага і ўкрала дыван. Свой учынак растлумачыла тым, што ёй не хапала грошай на алкагольныя напоі, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Партызанскага РУУС г. Мінска Наталля ГАНУСЕВІЧ**. — Раней зламысніца была судзімая за забойства. Месяц таму ў адносінах да яе былі заведзены дзве крымінальныя справы за парушэнне патрабаванняў прэвентыўнага нагляду і крадзеж. Цяпер жанчыне пагражае пазбаўленне волі тэрмінам да чатырох гадоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ■ Да ведама

# НА ВУГРА — БЕЗ ПРАМЫСЛОВАЙ МЕРЫ

**Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя вызначыла месцы і ўмовы прамысловага вылаву вугра без выканання прамысловай меры ў рыбалоўных угоддзях у 2017 годзе.**

Гэта прадугледжана пастановай Мінпрыроды ад 27 сакавіка 2017 года №12, якая апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале і ўжо ўступіла ў сілу. Дакументам устаноўлена, што прамысловы вылаў вугра без выканання прамысловай меры з 1 красавіка па 30 мая ў Мінскай вобласці і з 10 красавіка па 8 чэрвеня ў Віцебскай вобласці вядзецца сталыянарнымі пасткамі ў рэках Друйка, Дрысвята і Нешчарда.

Лавіць вугра пераноснымі пасткамі з ячэйкай не менш за 16 міліметраў дазволена на акваторыі вадаёмаў у радыусе не больш за 250 метраў ад месцаў упадзення, вытока вадаёмаў або злучэння з іншымі воднымі аб'ектамі на азёрах Набіста-Дзедзіна, Вісяты, Укля, Осталава, Іказнь, Дрывяты, Струста, Войса, Неспіш, Балойса, Недрава, Снуды, Волас Паўночны, Вялікія Швашты, Нешчарда, Наўліцкае, Сіта, Паульскае, Турасы, Пагошча, Абстэрна, а таксама ў рэках Акунёўка, Рака, Друйка, Усвіца, Дробня, Скема, Нарачанка, Смолка, Свірыца (Свіранка), Мядзелка, Страча і пратокі паміж возерам Струста і возерам Войса.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*


**Извещение о проведении 12 мая 2017 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль»**

**Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)**

| № | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | «Склад масел и химикатов» общей площадью 400 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 630/С-59751, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, д. 143 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 57 800,00 | 5 780,00 |
| 2 | «Склад для хранения кабельной продукции» общей площадью 153,4 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 630/С-74168, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, д. 143/20 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 27 360,00 | 2 736,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Электромодуль», ул. Великий Гостинец, 143, 222310, г. Молодечно.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предметов торгов в соответствии с протоколом о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» №3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся 12 мая 2017 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 10.04.2017 по 10.05.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36**
**(государственное предприятие «МГЦН»);**
**(0176) 74-72-04 (ОАО «Электромодуль»)**